# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2017»

*Чацвер, 16 лютага 2017 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі слоў у прыказцы?

*Учужойстаронцынетаксвеціцьісонца.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**2.** У народных павер’ях Дамавік – … .

**А)** ахоўнік лесу. **Б)** ахоўнік поля. **В)** ахоўнік дамашняга ачага.
**Г)** ахоўнік вадаёма. **Д)** ахоўнік бані.

**3.** Як называюць каманду карабля ці самалёта?

**А)** экіпаж. **Б)** звяно. **В)** калектыў. **Г)** група. **Д)** атрад.

**4.** У народзе існуе прыкмета:

*Калі вясёлка ў небе высокая і крутая, то будзе … .*

**А)** вецер. **Б)** дождж. **В)** спякота. **Г)** снег. **Д)** зацішша.

**5.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словы:

*1) соўс; 2) акварыўм; 3) шэдэўр; 4) раўнд.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**23.** Выключна рэдкая, каштоўная рэч называецца … .

**А)** рэрытэт. **Б)** рарэтэт. **В)** рарытэт. **Г)** рырытэт. **Д)** рыратэт.

**24.** Вызначце з дадзеных правільна напісаныя словы.

*1) біолаг; 2) аксіёма; 3) біяграфія;*
*4) археолаг; 5) біалогія; 6) ідэолаг.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** толькі 2. **Г)** 1, 3, 5. **Д)** 2, 4, 6.

**25.** Хто з’яўляецца аўтарам вершаваных казак для дзяцей “Цудоўная знаходка”, “Залатыя зярняты”, “Кветкі – сонцавы дзеткі”?

**А)** У. Караткевіч. **Б)** У. Дубоўка. **В)** А. Куляшоў.
**Г)** М. Стральцоў. **Д)** М. Багдановіч.

**26.** Слова, як вядома, можа ўзрадаваць, а можа і параніць. Нездарма ў народзе ёсць вобразнае параўнанне:

*1) Слова як … . 2) Язык як … .*

Якіх слоў не хапае? Падбярыце патрэбныя варыянты.

*а) цукар; б) соль; в) мёд; г) перац.*

**А)** 1-а, 2-б. **Б)** 1-б, 2-в. **В)** 1-б, 2-г. **Г)** 1-в, 2-г. **Д)** 1-а, 2-в.

**27.** Хто з вядомых беларускіх дзеячаў стаў паслядоўнікам і прадаўжальнікам асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны?

*1) Ігнат Буйніцкі; 2) Ігнат Смалянін; 3) Сымон Будны; 4) Васіль Цяпінскі.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**28.** Самым старажытным знакам прыпынку з’яўляецца … .

**А)** кропка. **Б)** коска. **В)** працяжнік. **Г)** двукроп’е. **Д)** пытальнік.

**29.** Хто з мастакоў слова, захоплены батлейкай, якую ўбачыў у 1916 годзе ў Мінску, стварыў вершаваную містэрыю ў 4 актах “На Каляды”?

**А)** Змітрок Бядуля. **Б)** Цішка Гартны. **В)** Ядвігін Ш.
**Г)** Максім Багдановіч. **Д)** Максім Гарэцкі.

**30.** Першыя беларускія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом, з’явіліся ў сярэдзіне … .

**А)** XIV стагоддзя. **Б)** XV стагоддзя. **В)** XVI стагоддзя.
**Г)** XVII стагоддзя. **Д)** XVIII стагоддзя.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 29800 экз. г. Мінск. 2017 г.

**6.** Закончыце вершаваныя радкі Соф'і Шах.

*У маі зацвітае, –*
*Уся белая такая,*
*Уся водару такога,*
*Што будзеш помніць доўга,*
*Як між вярбы ды вольхі*
*Цвіў пышны куст … .*

**А)** ядлоўцу. **Б)** півоні. **В)** ружы. **Г)** чаромхі. **Д)** бэзу.

**7.** Якое слова з прапанаваных можа выконваць ролю прыслоўя і дзеяслова?

*1) запар; 2) нацяньkі; 3) углыб; 4) туга.*

**А)** няма патрэбнага слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**8.** Якога лічэбніка не хапае ў народных выслоўях?

*1) На … двароў адзін тапор, і той без тапарышча.*
*2) … разоў глядзі, а назад не вядзі.*
*3) Мароз … баб павёз.*
*4) Чорт … пар лапцей стаптаў, пакуль пару дабраў.*

**А)** два. **Б)** пяць. **В)** шэсць. **Г)** сем. **Д)** восем.

**9.** Дадзены словазлучэнні:

*1) будні час; 2) будзённы клопат; 3) будні занятак.*

Якое словазлучэнне складзена няправільна?

**А)** усе словазлучэнні складзены правільна.
**Б)** усе словазлучэнні складзены няправільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Пляцоўка для стаянкі, узлёту, пасадкі і абслугоўвання лятальных апаратаў называецца … .

**А)** аерадром. **Б)** аэрадром. **В)** аэрыдром. **Г)** арадром. **Д)** арэдром.

**11.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) ледзьве; 2) семьсот; 3) дзьвюх; 4) верфь.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** толькі 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**12.** У якіх выразах на месцы пропуску напішаце часціцу *ні*?

*1) няма __ душы;*
*2) немагчыма __ прыйсці;*
*3) __ рыба __ мяса;*
*4) пакуль __ позна.*

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма патрэбных выразаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

**13.** Выдзеленыя словы ў пары словазлучэнняў ***актыўны*** *ўдзел* – ***пасіўны*** *баланс* з'яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** мнагазначнымі словамі.

**14.** У якім сказе на месцы пропуску патрэбна паставіць коскі?

*1) Так і не прывык ён за сваё жыццё сядзець _ склаўшы рукі.*
*2) Ішлі яны праз лес _ не спяшаючыся.*
*3) Дзеці _ не змаўляючыся _ пабеглі ўрассыпную.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**15.** Выберыце з прапанаваных выраз(-ы), які(-ія) з'яўляецца(-юцца) сінонімам(-і) устойлівага спалучэння *як гром з яснага неба*.

*1) рассыпацца драбней маку; 2) ні адсюль ні адтуль; 3) на адзін манер.*

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**16.** Мабыць, усім знаёмы словы "Калыханкі":

*Доўгі дзень,*
*Цёплы дзень*
*Адплывае за аблокі.*
*Сіні цень,*
*Сонны цень*
*Адпаўзае ў кут далёкі…*

Хто з'яўляецца аўтарам слоў гэтай цудоўнай песні?

**А)** У. Дубоўка. **Б)** Г. Бураўкін. **В)** Н. Гілевіч.
**Г)** У. Карызна. **Д)** Л. Пранчак.

**17.** Змяненне звычайнага парадку слоў ці словазлучэнняў як стылістычны прыём называецца … .

**А)** гіпербала. **Б)** метафара. **В)** алітэрацыя. **Г)** інверсія. **Д)** асананс.

**18.** Якая рака называецца сімвалам Беларусі?

**А)** Прыпяць. **Б)** Нёман. **В)** Дзвіна. **Г)** Свіслач. **Д)** Шчара.

**19.** Рэпартаж адносіцца да інфармацыйнага жанру … .

**А)** мастацкага стылю. **Б)** гутарковага стылю.
**В)** навуковага стылю. **Г)** публіцыстычнага стылю.
**Д)** афіцыйна-дзелавога стылю.

**20.** Дадзены словы:

*1) саванна; 2) калонна; 3) насенне; 4) группа; 5) каллекцыя.*

Выберыце правільна напісаныя словы.

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**21.** У якім слове з прапанаваных допушчана памылка ў напісанні?

*1) брыліянты; 2) заяжджаць; 3) шмат-павярховы.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбнага слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Здаўна для ўпрыгожвання жаночага адзення, бялізны выкарыстоўваюцца … .

**А)** каснікі. **Б)** пацеркі. **В)** фальбоны. **Г)** карункі. **Д)** гафт.